# ЁН РОДАМ З КУЗЬКАВІЧ

Федар Фёдаравіч Раўчакоў нарадзіўся 27 верасня 1910 года ў вёсцы Кузькавічы Быхаўскага павета ў сялянскай сям'і. Да 1928 года працаваў на сельскай гаспадарцы, потым на шклозаводзе "Ільіч" у вёсцы Ветранка. У 1928 годзе быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі і накіраваны ў палкавую школу, а пасля ў Ленінградскае ваенна-ветэрынарнае вучылішча, якое закончыў у 1933 годзе. У 1937 годзе па стану здароўя Раўчакоў дэмабілізаваўся з Чырвонай Арміі і працаваў на ветэрынарных участках у Журбянцах, Галадзьках Бярдзічаўскага раёна на Украіне. У маі 1941 года яго прызываюць на службу ў Чырвоную Армію. Айчынную вайну Раўчакоў сустрэў на Заходняй граніцы, тут прыняў першы бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 1 верасня ў баі быў цяжка паранены. Нямала часу спатрэбілася медыкам, каб зноў паставіць воіна на ногі. У 1943 годзе, пасля заканчэння 2-га Маскоўскага пяхотнага вучылішча, яго прызначаюць. камандзірам узвода ў 965-ы полк 274-й стралковай дывізіі. 3 жніўня 1943 года ў баі Раўчакоў атрымаў цяжкую кантузію. Пасля вяртання са шпіталю старшы лейтэнант Раўчакоў прыняў стралковую роту. У 1944 годзе ён становіцца членам КПСС.

Чалавек цвёрдай волі, уважлівы да сваіх падначаленых, смелы ў баі –такім ведалі Фёдара Фёдаравіча Раўчакова байцы. Яны паважалі, любілі і цанілі свайго ротнага, смела ішлі за ім на выкананне любога задання.

...Жорсткі бой разгарэўся 29 ліпеня 1944 года. Пехацінцы Раўчакова вырваліся да берага Віслы ў .раёне горада Пулава. (Польшча) і ротны з групай салдат пад моцным артылерыйска-мінамётным агнём на рыбацкай лодцы пераправіўся цераз раку і захапіў плацдарм. Здрыўшыся ў зямлю, салдаты моцным кулямётным агнём стрымлівалі контрнаступаючага праціўніка, а старшы лейтэнант Раўчакоў, вярнуўшыся зноў на ўсходні бераг, арганізаваў пераправу астатніх байцоў сваёй роты. Не прайшло і гадзіны, як уся рота фарсіравала Віслу.

У той дзень фашысты пяць разоў узнімаліся ў атаку ва жменьку савецкіх воінаў, імкнучыся спіхнуць іх у каламутныя воды ракі. Але іх намаганні былі дарэмнымі. Нашым байцам да зыходу дня ўдалося расшырыць плацдарм.

На світанні 30 ліпеня гітлераўцы пры падтрымцы танкаў і самаходных гармат прадпрынялі шалёную атаку, спрабуючы знішчыць роту Раўчакова. Тройчы паднімаў старшы лейтэнант байцоў у контрататакі, разграміў і адкінуў ворага, захапіўі пануючую вышыню і канчаткова замацаваўся на плацдарме.

За здзейснены подзвіг Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 года Раўчакову Фёдару Фёдаравічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У маі 1945 года Раўчакоў звальняецца ў запас і прыязджае на радзіму. Тут яго чакаў новы фронт – аднаўленне разбуранай акупантамі народнай гаспадаркі. Працуючы намеснікам дырэктара Кузькавіцкай МТС па палітчастцы, ён аддаў шмат сіл уздыму сельскай гаспадаркі. У канцы 1947 года ён з сям'ёй пераехаў пад Ленінград і працаваў на ветучастку ў вёсцы Надбелле. Там яго 20 красавіка 1952 года і напаткала смерць.

**Ён родам з Кузькавіч // Маяк Прыдняпроўя (Быхаў). — 1983. — 12 ліпеня. — С. 3.**